- прозвішча, імя, імя па бацьку і пасада асобы, якая складала пратакол;
- калі, дзе і якое правапарушэнне Вы здзейснілі;
- хто быў сведкай гэтага адміністрацыйнага правапарушэння.

ВЫ МАЕЦЕ ПРАВА прыкласці да пратакола Вашыя **пісьмовыя тлумачэнні.** Калі Вам не даюць магчымасці зрабіць запіс ў самім пратаколе, напішыце Вашыя тлумачэння асобна і настойвайце, каб у пратаколе было ўказана, што Вашыя тлумачэнні **прыкладаюцца** да пратакола.

Вы можаце адмовіцца падпісваць пратакол, но лепш **самастойна** запісаць, чаму Вы гэта робіце.

**8.** АДМІНІСТРАЦЫЙНАЕ ЗАТРЫМАННЕ НЕ ПАВІННА ПЕРАВЫШАЦЬ **ТРОХ** (3) ГАДЗІНАЎ.

Але, калі Вас абвінавачваюць у здзейсненні

- мелкага хуліганства;
- парушэнні парадка арганізацыі і правядзення сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў і дэманстрацыяў;
- гандлі ў неўстаноўленых месцах;
- незаконнам гандлі таварамі або дробнай спекуляцыі,

Вы можаце быць затрыманыя ДА РАЗГЛЯДУ СПРАВЫ суддзёй ці начальнікам (намеснікам начальніка) міліцыі.

**Тэрмін адміністрацыйнага затрымання пачынае адлічвацца** з моманта дастаўлення **Вас у міліцыю.**

**9.** Аб сваёй нязгодзе з затрыманнем, асабістым даглядам, адабраннем у Вас рэчаў Вы маеце права напісаць **у скарзе ў суд, начальніку органа ўнутраных справаў або пракурору.**

**ЗАЎСЁДЫ ПАМЯТАЙЦЕ:**

***Вы знаходзіцеся ва ўладзе міліцыі.***

***Не панікуйце, не губляйцеся, не паказвайце страха.***

***Не спрэчайцеся, не паддавайцеся на правакацыі, не ўвязвайцеся ў канфлікт.***

***Будьце ўпэўненыя ў сабе, спакойныя, ветлівыя.***

***Усе парушэнні закона, якія дапушчаныя ў адносінах да Вас, з'яўляюцца падставай для наказання віноўных работнікаў міліцыі.***

*Пасля вызваляння тэрмінова звяртайцеся да адваката, у праваабарончыя арганізацыі.*

ВЫБІРАЙ
09.09.2001

# ІНСТРУКЦЫЯ

## па юрыдычных пытаннях для арганізатараў і ўдзельнікаў мабілізацыйнай кампаніі.

**Юрыдычныя ўмовы мабілізацыйнае кампаніі.**

Зыходзячы з дзеючага заканадаўства, якое рэгулюе працэс выбараў прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь, мабілізацыйная кампанія зьўляецца даволі своеасаблівай часткай агульнай прадвыбарчай кампаніі.

**Арт. 45 Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусь** дае магчымасць **без атрымання дазволу** з боку органаў выканаўчай улады праводзіць масавыя мерапрыемствы, якія напрамую звязаныя з выбарамі прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь.

*«Гражданам Республики Беларусь, политическим партиям, другим общественным объединениям, трудовым коллективам, доверенным лицам кандидатов в Президенты Республики Беларусь, инициативным группам, проводящим агитацию за избрание кандидатов в Президенты Республики Беларусь, представляется право свободного и всестароннего обсуждения предвыборных программ кандидатов в Президенты Республики Беларусь, их политических, деловых и личных качеств, проведения агитации «за» или «против» кандидата на собраниях, митингах, в средствах массовой информации, а также во время встреч с избирателями.»*

Аналіз дадзенай часткі арт. 45 Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусь паказвае, што свабоднае правядзенне масавых мерапрыемстваў **(без атрымання дазволу органаў мясцовай улады) тычыцца толькі** моманта абмеркавання **праграмаў кандыдатаў, іх асабістых якасцяў, палітычных пазіцыяў і інш.** Гэта паказвае, што **акцыі,** якія плянуюцца **ў межах мабілізацыйнае кампаніі з большага не падпадаюць пад дзеяння арт. 45** Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусь і **могуць**
праводзіцца **толькі** з дазволу органа мясцовай выканаўчай улады.

Нават калі падвесьці правядзеньне акцыяў мабілізацыйнай кампаніі пад дзеяньне артыкула 45 Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусь, то гэта магчыма **толькі пасьля рэгістрацыі асобаў** за якіх зьбіралі подпісы **ў якасьці кандыдатаў у прэзыдэнты Рэспублікі Беларусь**. Гэта рэгістрацыя праводзіцца Цэнтральнай выбарчай камісіяй за 35-25 дзён да выбараў. Увесь ранейшы час (да моманту рэгістрацыі кандыдатаў) публічныя акцыі могуць праводзіцца **толькі** ў агульным парадку з атрыманьнем дазволу ў органах мясцовай выканаўчай улады.

Арт. 45 Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусь таксама дае вычарпальны сьпіс формаў правядзеньня публічных прадвыбарчых акцыяў з мэтай агітацыі.



нага кодэкса (КПК), але Вы павінны ведаць, што Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь **(арт. 62)** Вам гарантуецца права карыстацца дапамогай адваката **ў любы момант.**

3. **Вы маеце права** адмовіцца даваць якія-небудзь тлумачэнні і нічога не падпісываць **(пакуль Вы не пагаворыце з адвакатам).**

**4. Вы маеце права ведаць, чаму Вас затрымалі**.

Ваша затрыманне можа быць звязана з тым, што Вас абвінавачваюць у здзейсненні адміністрацыйнага правапарушэння. Гэта называецца **адміністрацыйным затрыманнем.**

Калі Вашае затрыманне звязанае з крымінальнай справай, **нічога не падпісвайце і адмаўляйцеся размаўляць са следчым** або кім-небудзь іншым да таго часу, пакуль Вам не дадуць магчымасці скарыстацца Вашым КАНСТЫТУЦЫЙНЫМ ПРАВАМ на юрыдычную дапамогу і сустрэцца з адвакатам.

***Напісанае ніжэй тычыцца адміністрацыйнага затрымання.***

**5.** Міліцыя **абавязана скласці пратакол** аб Вашым адміністрацыйным затрыманні.

У гэтым пратаколе павінны быць указаныя: *дата, месца складання, ЧАС, МЕСЦА і ПАДСТАВЫ* Вашага затрымання, *прозвішча, імя, імя па бацьку і пасада асобы, якая складае пратакол.*

УВАЖЛІВА прачытайце гэты дакумент. Вы маеце права яго **не падпісваць** (і пісьмова ўказаць, чаму Вы адмаўляецеся гэта зрабіць). Вы маеце права зрабіць запіс у пратаколе аб усім, з чым Вы не згодныя, патлумачыць Вашае стаўлення да затрымання.

**6.** Міліцыя мае права провесці **асабісты дагляд** Вас і Вашых рэчаў. Асабісты дагляд павінен праводзіцца асобай **аднаго з Вамі полу** ў прысутнасці дзвух сведкаў (панятых) **таго ж полу.**

**Пры асабістым даглядзе міліцыя мае права адабраць Вашы рэчы і дакументы. ЗВЯРНІЦЕ УВАГУ, каб у пратаколе былі пералічаныя і дакладна апісаныя усе адабраныя ў Вас рэчы і дакументы.**

**7.** Дакументам, на падставе якога Вас могуць прыцягнуць да адміністрацыйнай адказнасці, з'яўляецца пратакол аб адміністрацыйнам правапарушэнні. Пры складанні гэтага пратакола Вам павінны патлумачыць Вашыя правы.

ВЕЛЬМІ УВАЖЛІВА прачытайце гэты пратакол. У ім павінны быць указаныя:

- дата і месца складання пратакола;

## <u>У судзе</u>

1. Пасля растлумачэння суддзёй Вашых правоў заявіце хадайніцтвы: аб допуску ў працэс <u>прадстаўніка</u> (асабістага ці ад праваабарончай арганізацыі); <u>аб адвакаце</u>; <u>аб азнаямленні</u> (разам з адвакатам і прадстаўнікамі) <u>з матэрыяламі справы;</u> <u>аб допыце сведкаў абароны</u> (укажыце каго канкрэтна – прозвішча, імя, імя па бацьку).
2. <u>Ніколі не ілжыце</u>. Лепш **не сказаць** усёй праўды, чым сказаць **няпраўду.** Хай ілгуць міліцыянты.
3. <u>Суд – не мітынг</u>. <u>Не трэба агітаваць</u> – толькі інфармацыя аб фактычных абставінах: <u>час, месца, што рабілі, бачылі, чулі, хто можа пацвердзіць Вашыя словы.</u>

## <u>Пасля суда</u>

1. <u>Абавязкова напішыце</u> ў пракуратуру <u>скаргу на незаконнае затрыманне.</u> Калі прысуд апраўдальны – у скарзе <u>патрабуйце прыцягнення да адказнасці тых, хто</u>
затрымаў і ілжэсведчыў у судзе. Укажыце адрас па якім пракуратура павінна прыслаць адказ.
2. Калі Вас апраўдалі – падавайце ў суд іск аб кампенсацыі маральнай шкоды.

## Калі Вас затрымалі і даставілі ў міліцыю, ВЕДАЙЦЕ, ШТО:

**1.** Вы маеце права патрабаваць, каб міліцыя **неадкладна** ўведаміла Вашых сваякоў аб Вашым месцы знаходжання. Міліцыя **абавязана** зрабіць гэта ў адпаведнасці з артыкулам 6 Закона «Аб міліцыі».
Вашым сваякам ці сябрам варта не марнаваць час і звяртацца да адваката (у любую юрыдычную кансультацыю) для Вашай абароны.
**2**. Вы маеце права **карыстацца дапамогай адваката.** Міліцыя абавязана даць Вам магчымасць **сустрэцца** з адвакатам, але <u>НЕ абавязана</u> прадставіць Вам адваката. Таму важна як мага хутчэй паведаміць сваякам ці сябрам аб Вашым затрыманні.
Калі міліцыя гаворыць, што Вы не маеце права на дапамогу адваката або што адвакат можа ўдзельнічаць толькі пры разглядзе Вашай справы ў судзе, **НЕ ВЕРЦЕ.** Міліцыя можа спасылацца на артыкулы Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях (КаАП) ці нават Крымінальна-працэсуаль-



## Дазволены толькі такія формы:

1. сход;
2. мітынг;
3. выступленьні ў сродках масавай інфармацыі;
4. сустрэчы з выбаршчакамі;

**Форма** «сустрэча з выбаршчыкамі» **зьяўляецца самай лепшай формай,** пад якую можна падвесьці акцыі мабілізацыйнай кампаніі. Калі тлумачэньні іншых формаў дазволеных мерапрыемстваў даюцца ў іншых нарматыўна-прававых актаў Рэспублікі Беларусь, то **форма** <u>«сустрэча з выбаршчыкамі»</u> ***<u>нідзе</u>*** **не прапісана і *<u>не дано</u>* тлумачэньне гэтай формы мерапрыемства.** У заканадаўстве Рэспублікі Беларусь толькі ў арт. 155 Выбарчага кодэксу Рэспублікі Беларусь даецца тлумачэньне тэрміну «Прадвыбарчая агітацыя»**. Пад гэты тэрмін падпадае і агітацыя з мэтай заахвоціць грамадзянаў для ўдзелу ў выбарах.** Алеж гэты артыкул толькі тлумачыць тэрмін «Прадвыбарчая агітацыя», не рэгламентуючы парадак правядзеньня агітацыі па заахвочваньню грамадзян да ўдзелу ў выбарах.
Акцыі мабілізацыйнай кампаніі з пункту гледжаньня права можна падзяліць **на 3 групы.**
I. **У першую групу** можна аднесьці **акцыі, якія не патрабуюць <u>ніякага дазволу</u>.** Дазвол на правядзеньне дадзеных мерапрыемстваў не патрабуецца ў любой форме.
Такімі акцыямі зьяўляюцца:

1. абтэлефанаваньні ў любой іх форме;
2. падарункі выбаршчыкам;
3. вандроўкі;
4. паказ відыёфільмаў;

і іншыя акцыі такога накірунку.
II. **Другой групай** акцыяў зьўляюцца акцыі, якія патрабуюць рознаўзроўневага дазволу з боку мясцовых уладаў, ці іншых адказных асобаў.

**1. Шэсьці і мітынгі.**

*(Патрабуюць дазволу мясцовага выканаўчага камітэту.)* **Заяўнікамі на мерапрыемствы з удзелам да 1000 чалавек могуць зьяўляцца грамадзяне Рэспублікі Беларусь, калі ўдзельнікаў больш 1000 чалавек - толькі грамадскіе аб'яднаньні, палітычныя партыіі. Дазвол на акцыі з удзелам больш як 1000 удзельнікаў даюць абласныя выканаўчыя камітэты і Мінгарвыканкам. Заяўкі на акцыі падаюцца не пазней 15 дзён да іх правядзеньня.**

2. **Акцыі ў закрытых памешканьнях** (патрабуюць дазволу на арэнду памешканьня з боку уласьніка гэтага памешканьня.)

III. **Трэцяй групай** зьяўляюцца такія акцыі, якія цалкам падпадаюць пад дзеяньні КаАП і ўдзельнікі гэтых акцыяў могуць быць прыцягнуты да адміністратыўнай адказнасьці.

1. Надпісы на дарогах.
2. Пэрфоманс.
3. Рэкляма на кіёсках.

Магчымы дазвол можна атрымаць у рэклямным аддзеле Белсаюздруку, Белпошты.

**Так як кожная акцыя мабілізацыйнай кампаніі носіць спецыфічны характар і патрабуе асобнага юрыдычнага падыходу і аналізу дзеючага заканадаўства, то пажадана, каб кожная акцыя рыхтавалась зыходзячы з парадаў юрыстаў.**

## Абарона сваіх правоў пры затрыманьні ўдзельнікаў мабілізацыйнай кампаніі.

### Парады на памяць

Не займайцеся справамі, калі выпілі хаця б піва - могуць прыцягнуць па арт. 159 КаАП і пазасудовым парадкам аформіць да 15 сутак.

Калі распаўсюджваеце улёткі якой-небудзь арганізацыі (партыі, прафсаюза і інш.) – майце пры сабе ксеракопію пасведчання аб яе рэгістрацыі (пастаноўцы на ўлік).

У пратаколе аб адміністрацыйным правапарушэнні абавязкова павінен быць указан артыкул КаАП, які Вы парушылі. Падскажыце міліцыянтам – хай запішуць арт.167-3 – «Парушэнне заканадаўства аб выбарах».

### Праваабарончыя арганізацыі

Праваабарончы цэнтр «Вясна» т. 231-08-44.
«Прававая дапамога насельніцтву» т. 266-18-47.
Цэнтр па правах чалавека т. 221-58-68.
Беларуская асацыяцыя журналістаў (БАЖ) т. 223-63-55
Беларускі Хельсінскі камітэт (БХК) т. 222-48-00.

**Майце пры сабе пашпарт.**

**Майце пры сабе мелка нарэзаныя паперкі з нумерамі тэлефонаў сяброў, знаёмых, свайго офіса.**



### Затрыманне

1. Пры затрыманні людзьмі ў форме не распускайце рукі – можна трапіць пад дзеянне крымінальнага кодэксу.
2. Супрацьдзеянне невядомым у цывільным (якія не прадстаўляюцца) не з'яўляецца правапарушэннем: а раптам гэта бандыты.
3. Пры затрыманні кідайце паперкі з тэлефонамі і выкрыкніце ў разліку на прысутных: «Я – такі-та, патэлефануйце па гэтых тэлефонах»- заўсёды знойдзецца чалавек, які гэта зробіць.
4. Пасадзілі ў машыну – абмяняйцеся (лепш пісьмова, каб не забыцца) з іншымі затрыманымі тэлефонамі і адрэсамі: на судзе будзеце адзін у аднаго сведкамі абароны.
5. Зафіксуйце час затрымання. Звярніце на гэта ўвагу іншых затрыманых. (**Час затрымання пачынае цекчы з моманту дастаўкі Вас у аддзяленне міліцыі).**
6. Запомніце, ў што былі апранутыя тыя, хто затрымліваў Вас, што ў іх было на нагах, на галовах – згадзіцца ў судзе.

### У міліцыі

1. Прывезлі ў РУУС, апорны пункт ці ў іншае месца – зафіксуйце час, звярніце на гэта ўвагу іншых затрыманых разам з Вамі ці тых, хто ўжо знаходзіцца ў памешканні. (Не звязвайцеся з бамжамі або алкашамі – падвядуць).
2. Склалі пратакол аб адміністрацыйным правапарушэнні – уважліва прачытайце яго. Патрабуйце ўказання часу складання пратаколу ці запішыце яго самі.

Маеце права не падпісваць пратакол – наступстваў – ніякіх. (Лепей – не падпісваць).

3. Патрабуйце ад міліцыі, каб яны паведамілі аб Вашым затрыманні дамоў або на працу — яны абавязана зрабіць гэта. (Але не прасіце **даць Вам** патэлефанаваць – не дадуць, і будуць правы).
4. Могуць правесці асабісты дагляд і адабраць рэчы, прадметы, дакуманты. Прасачыце, каб у пратаколе было пералічана не толькі ўсё адабранае, а і падрабязнае апісанне адабраных рэчаў.
5. Затрымліваць у міліцыі могуць не больш за 3 гадзіны (пры наяўнасці пашпарта ці іншага дакумента). Калі справа будзе перадавацца ў суд – могуць пратрымаць да суда.